УДК 378.096:[75+76]:94(476.5-25)

# Дзявяты выпуск мастацка-графічнага факультэта: траекторыі творчых лёсаў

***Цыбульскі М.Л.***
*Установа адукацыі "Віцебскі дзяржаўны ўніверсітэт імя П.М. Машэрава", Віцебск*

*Сустрэча выпускнікоў мастацка-графічнага факультэта Віцебскага пэдінстытута 1970 года, якая рыхтавалася да 50-гадовага юбілею гэтага выпуску ў 2020 годзе, на жаль, не адбылася з-за эпідэміі каронавіруса. Шмат у чым па названай прычыне не ўдалося рэалізаваць і грандыёзны выставачны праект, прымеркаваны да гэтай даты. Аднак ніякія знешнія падзеі не здольныя адмяніць шчырага жадання людзей, што прайшлі доўгі шлях у мастацтве, навуцы, педагогіцы, выказаць удзячнасць альма-матар, сваім педагогам і сябрам, што былі побач. Прайшло дастаткова часу, каб не толькі вызначыць ключавыя падзеі гістарычнага перыяду, але і ролю пакалення, якое ў другой палове 60-х пачынала самастойны жыццёвы і творчы шлях.*

*Артыкул уключае своеасаблівую рэканструкцыю адукацыйнай і творчай прасторы, што панавала на мастацка-графічным факультэце ў 1965–1970 гг. Аснову даследавання склалі не толькі архіўныя матэрыялы, але што не менш каштоўна, успаміны саміх студэнтаў гэтага часу. Менавіта ўспаміны выпускнікоў 1970 года, іх эмацыянальныя разважанні аб пражытым, часах студэнцтва значна ўзбагацілі сухую фактаграфію гістарычнага мінулага мастацка-графічнага факультэта Віцебскага дзяржаўнага педагагічнага інстытута (зараз ВДУ імя П.М. Машэрава). Адметную частку складаюць успаміны пра перыяд паступлення ў інстытут, асаблівасці выкладання спецыяльных дысцыплін, паездкі на пленэры і арганізацыю мастацкіх выстаў, удзел у будаўнічых атрадах, творчыя захапленні студэнтаў і інш.*

***Ключавыя словы:*** *мастацка-графічны факультэт, выпуск 1970-га года, Віцебскі дзяржаўны педагагічны інстытут, Віцебская мастацкая школа, Віцебская школа акварэлі, акварэль, алейны жывапіс, графіка, лінарыт, плакат, творчасць віцебскіх мастакоў.*

*(Искусство и культура. – 2023. – № 2(50). – С. 61–75)*

# The ninth graduation of the art and graphic faculty: trajectories of creative destinies

***Tsybulsky M.L.***
*Education Establishment "Vitebsk State P.M. Masherov University", Vitebsk*

*Unfortunately, the meeting of the graduates of the Faculty of Art and Graphics of the Vitebsk Pedagogical Institute in 1970, which was preparing for the 50th anniversary of this graduation in 2020, did not take place due to the coronavirus epidemic. In many ways, for the same reason, it was not possible to implement the grandiose exhibition project scheduled for this date. However, no external events can cancel the sincere desire of people who have come a long way in art, science, pedagogy, to express their gratitude to their alma mater, their teachers and friends who were there for them. Enough time has passed not only to define the key events of the historical period, but also to indicate the role of the generation that in the second half of the 60s began its independent life and creative path.*

*The article includes a kind of reconstruction of the educational and creative space that prevailed at the Faculty of Art and Graphics in 1965–1970. The basis of the research was not only archival materials, but what is no less valuable, the memories of the students themselves of that time. It was the memories of the graduates of 1970, their emotional reflections on their student days that significantly enriched the dry factography of the historical past of the Faculty of Art and Graphics of the Vitebsk State Pedagogical Institute (now VSU named after P.M. Masherov). A distinctive part consists of memories of the period of admission to the institute, peculiarities of teaching special disciplines, trips to open air and organization of art exhibitions, participation in construction teams, creative hobbies of students, etc.*

***Key words:*** *art and graphic faculty, graduation of 1970, Vitebsk State Pedagogical Institute, Vitebsk art school, Vitebsk watercolor school, watercolor, oil painting, graphics, line art, poster, creativity of Vitebsk artists.*

*(Art and Cultur. – 2023. – № 2(50). – P. 61–75)*

Сярод амаль 60-ці выпускаў, якія адбыліся за ўсю гісторыю існавання мастацка-графічнага факультэта ВДУ імя П.М. Машэрава, гэта выпуск быў неардынарны. "Ён застаўся ў маёй памяці як адзін з наймацнейшых, яркіх, творчых", – адзначала ў сваім выступленні на святкаванні 60-гадовага юбілею факультэта куратар 52-й групы А.Ц. Жукава. І як паказала наступнае

*Адрас для карэспандэнцыі: e-mail: mtsybulsky@rambler.ru – М.Л. Цыбульскі*

жыццё ён стаў сапраўды "зорным", бо вялікая частка выпускнікоў гэтага года магутна заявілі аб сабе ў мастацтве, навуцы, педагогіцы".[1] Студэнты гэтага выпуску добра запомніліся не толькі педагогам, але і многім студэнтам, што вучыліся некалькімі гадамі пазней. "Сапраўды, патэнцыял гэтага курса быў відавочны нават яшчэ ў час іх вучобы. Мы часта з захапленнем разглядалі работы нашых старэйшых сяброў на праглядах і нават прыходзілі да іх у пакоі, ведаючы, што яны толькі што вярнуліся з пленэру".[2] А Ф. Кісялёву, які вучыўся на год пазней, запомніліся выставы, што рэгулярна арганізоўвалі студэнты старэйшага за яго на год курса. "Творы на іх не толькі вылучаліся высокім прафесійным узроўнем, але і былі адметныя пошукамі індывідуальнай манеры".[3]

У 1970 годзе мастацка-графічны факультэт скончылі 52 студэнты. Сярод выпускнікоў гэтага года 12 сяброў Беларускага саюза мастакоў, тры кандыдаты навук, прафесар, вялікая колькасць мастакоў, педагогаў, настаўнікаў выяўленчага мастацтва і чарчэння, якія працавалі ў сярэдніх школах, каледжах, універсітэтах. "Наш курс быў дружны, творчы, актыўны. Ці не ўпершыню ў гісторыі мастацка-графічнага ў выпускнікоў гэтага года ўзнікла ідэя ўвекавечыць дадзеную падзею. Ініцыятары ўсталявалі ў скверы насупраць навучальнага корпуса МГФ на скрыжаванні вуліц Суворава і Чэхава вялікі валун, на якім вычаканілі надпіс «ХГФ-70»".[4] Гэты камень і сёння захоўвае памяць аб тых часах, з'яўляецца своеасаблівым сімвалам дадзенага творчага пакалення.

Мэта артыкула – аналіз і рэканструкцыя вучэбнай і творчай атмасферы на мастацка-графічным факультэце 1965–1970 гг., вызначэнне найбольш яскравых падзей і накірункаў дзейнасці студэнтаў у гэты перыяд. Важнай часткай даследавання стала асэнсаванне творчых лёсаў выпускнікоў мастацка-графічнага факультэта 1970 года.

**"Час, наперад!".** Гэты слоган стаў бадай што сапраўдным сімвалам развіцця савецкага грамадства ў 1965–1970-я гг. і адлюстроўваў энтузіязм моладзі, якая тварыла будучыню краіны. Невыпадкова фрагмент музычнай тэмы аркестравай сюіты кампазітара Г. Свірыдава "Час, наперад!", з сярэдзіны 1960-х быў надзвычай папулярны, а з 1968 года стаў застаўкай інфармацыйнай праграмы "Время", якая выйшла ў прамым эфіры на Першым канале ЦТ. Краіна ішла наперад з верай у светлую будучыню. Аптымізм і энтузіязм пасляваеннага пакалення, яго светапоглядная сталасць усялялі веру і надзею. Многія з прадстаўнікоў гэтага пакалення ў 1965 годзе былі выпускнікамі сярэдніх школ, рабілі свой выбар у жыцці. Віцебскі педагагічны інстытут быў адной з папулярных навучальных устаноў у гэты час. Да і першыя гады дзейнасці мастацка-графічнага факультэта зрабілі яго вядомым, паколькі знайшлі адлюстраванне ў рэспубліканскім і абласным друку [1]. Значнасць і высокая запатрабаванасць новай для краіны спецыяльнасці – "настаўнік малявання, чарчэння і працы", падрыхтоўкай якога займаўся гэты факультэт, – была відавочнай. Адначасова многія з тых, хто імкнуўся паступіць на мастацка-графічны, успрымалі яго як шлях удасканалення сябе ў мастацтве, як магчымасць стаць мастаком, творцай.

**Выбар прафесіі. Паступленне.** Паступаць на мастацка-графічны факультэт, які да таго часу існаваў крыху больш за пяць гадоў, яны прыехалі з розных месцаў. Ды і падрыхтоўка ва ўсіх па спецыяльных прадметах была розная. У адных за плячыма мастацкая школа ці вучоба ў мастацкіх студыях. Нехта ж ішоў вучыцца з "нуля". "Будучы яшчэ вучнем магілёўскай сярэдняй школы, я патрапіў у творчую майстэрню М.М. Волахава, вядучага мастака Магілёўскага абласнога драматычнага тэатра, – узгадваў У. Напрэенка, – пазней дзякуючы П.В. Масленікаву я спасцігаў асновы акадэмічнага малюнка і жывапісу на падрыхтоўчых курсах Беларускага тэатральна-мастацкага інстытута. У Віцебск на экзамены я ехаў будучы нядрэнна падрыхтаваным".[5]

Юрый Чарняк захапляўся маляваннем з другога класа. "Рабіў копіі партрэтаў Леніна, Маякоўскага, маляваў акварэллю. Недзе ў сёмым ці восьмым класе нават дапамагаў свайму выкладчыку Цімафееву рабіць афішы для кінатэатра «Кастрычнік», дзе той падпрацоўваў. Са школы хадзіў на вуліцу Кірава, дзе седзячы на алеі рабіў накіды з людзей. (...) Немалаважную ролю адыграла і тое, што класным кіраўніком у школе ў мяне была Ірына Антонаўна Беразінская – жонка Р.П. Клікушына. Яна выкладала ў нас літаратуру, а яе сын Валодзя вучыўся са мной у адным класе. Разам з Валодзем я некалькі разоў удзельнічаў у раённых конкурсах па малюнку. Напярэдадні паступлення я сустракаўся з Клікушыным і паказваў яму свае работы. Ён сказаў: можаш паступіць. Але тым не менш я хадзіў на падрыхтоўчыя курсы, на якіх спачатку выкладаў Г. Смолін, а потым С.Х. Далматаў".[6]

[1] З выступлення А.Ц. Жукавай перад выпускнікамі. Запіс аўтара 2019 г.
[2] З успамінаў выпускніка МГФ 1972 года А. Шыёнка.
[3] З успамінаў выпускніка МГФ 1971 года Ф. Кісялёва.
[4] Успаміны Рэгіны Шабанавай. Рукапіс 2022 г.
[5] З успамінаў У. Напрэенкі. Запіс – май 2023 г.
[6] З успамінаў Юрыя Чарняка – май 2023 г.

Нямала было і тых, хто прыйшоў вучыцца з вытворчасці. “Пасля заканчэння вучылішча я працаваў у Віцебскім будтрэсце № 9. Да паступлення на мастацка-графічны факультэт я цэлы год рыхтаваўся ў студыі, якая размяшчалася ў палацы будтрэста, – узгадвае Мікалай Таранда. – Вёў заняткі В.Р. Шаталаў, ён мне дапамог засвоіць азы мастацтва”.[7] Другі будучы абітурыент – Віктар Данілаў успамінаў: “Я выйграў нейкі конкурс насценгазет у час працы на Вялікалуцкім радыёзаводзе і мне сказалі, ты ж добра малюеш, паступай вучыцца. Аднакласніца дапамагла мне напісаць дзве заявы: адну ў Ленінград, другую – у Віцебск. Я вырашыў, адкуль хутчэй прыйдзе адказ, туды і паеду на разведку. Прыйшло хутчэй з Віцебску. Пасля прыезду на віцебскі мастацка-графічны ў пачатку лета 1965 года мне пашанцавала патрапіць на кансультацыю да самога Клікушына. Але тады я зразумеў, што ўвогуле не ўмею маляваць. Да ўступных экзаменаў заставалася няшмат часу. Але ніякай нясмеласці ў мяне, токара трэцяга разраду, не было. Пасля вяртання дадому я набраў кніг у бібліятэцы і пачаў рыхтавацца”.[8]

Само паступленне – той перыяд, які запомніўся кожнаму з абітурыентаў. У жніўні 1965 года “пры паступленні здавалі малюнак, чарчэнне, матэматыку, фізіку і сачыненне”.[9] “Нам пашанцавала: за год да нашага паступлення адмянілі ўступныя экзамены па замежнай мове і матэматыцы”.[10] Большасць з апытаных узгадвалі пераважна экзамены па спецыяльнасці – малюнак і чарчэнне. Напэўна, у першую чаргу, з-за іх важнасці. Канешне, маляванне вучэбнага нацюрморта з натуры для адных абітурыентаў не было праблемай, але ж для іншых... “Паколькі я прыйшоў на экзамен па малюнку ў ліку апошніх, – узгадваў В. Данілаў, – то апынуўся ўжо ў канцы аўдыторыі. Наперадзе сядзеў мой новы сябра Коля Гугнін, які ўпэўнена будаваў кампазіцыю нацюрморта. Калі ён маляваў авал, то браў аловак то ў адну, то ў другую руку. А ў мяне авал не атрымліваўся... я глядзеў па баках, спрабуючы зразумець, як мне справіцца з малюнкам. Аднак неяк малюнак завяршыў. Тое, што я зрабіў, мне здалося гэта прыгожа. Калі ж нам аб’яўлялі вынікі, я быў вельмі здзіўлены і засмучаны – мне паставілі тройку. Урэшце рэшт мяне выратавала толькі тое, што я добра здаў астатнія экзамены”.[11]

[7] Інтэрв’ю з Мікалаем Тарандам. Запіс 2022 г.
[8] Інтэрв’ю з Віктарам Данілавым. Запіс 2022 г.
[9] Успаміны Яўгена Панамарэнкі. Рукапіс 2022 г.
[10] Інтэрв’ю з Мікалаем Тарандам. Запіс 2022 г.
[11] Інтэрв’ю з Віктарам Данілавым. Запіс 2022 г.

Знаёмства будучых студэнтаў паміж сабой пачыналася ў час уступных іспытаў. А працягнулася – у пачатку верасня, калі студэнтаў адправілі капаць бульбу.

**Вучоба на факультэце. Выкладчыкі.** Агульны паток, набраны ў 1965 годзе, складаў больш за 50 чалавек і быў традыцыйна падзелены на дзве групы. Заняткі па малюнку, жывапісу, кампазіцыі і іншых спецыяльных дысцыплінах праводзіліся па падгрупах. Як узгадвалі многія выпускнікі, значная частка студэнтаў з першага курса адказна і зацікаўлена працавала ў імкненні атрымаць добрую падрыхтоўку. Сваю ролю ў гэтым адыгрываў і той факт, што на ўсіх курсах тады хлопцаў было больш, чым дзяўчынак. І менавіта “хлопцы ў засваенні мастацтва задавалі тон”.[12] Жывапіс і малюнак займалі адно з самых важных месцаў. “Кожны з выкладчыкаў гэтых дысцыплін варты асаблівай увагі, – лічыць Яўген Панамарэнка. – У асноўным гэта былі самабытныя мастакі і добрыя спецыялісты, якія стараліся перадаць уласныя веды і свой багаты досвед нам, студэнтам”.[13]

Першы і другі курс былі прысвечаны засваенню акварэльнага жывапісу. “Нам вельмі пашанцавала, што на першым курсе азы акварэлі пачаў выкладаць Іван Міхайлавіч Сталяроў. (...) Ён паказваў нам прыёмы залівак, лесіровак, варыянты напісання дэталяў нацюрморта. Не любіў вычварнасці ў працы, стаяў за каларыстычна вытрыманую акварэль. І самае галоўнае, патрабаваў, каб акварэль заставалася акварэллю, каб белая папера прасвечвала скрозь фарбу і пакідала адчуванне лёгкасці і свежасці напісанага”.[14] І. Сталяроў надаваў шмат увагі эцюдам жывой прыроды, “звяртаў увагу студэнтаў на неабходнасць працы з натуры”.[15] “Добра памятаю першае заданне, якое прапанаваў нам Іван Міхайлавіч. Ён прымацаваў на высокі мальберт ліст паперы і на ім размясціў восеньскае лісце. Сталяроў увесь час знаходзіўся з намі ва аўдыторыі. У яго заўсёды можна было нешта спытаць”.[16]

Для некаторых студэнтаў знаёмства з акварэльным жывапісам адбылося ўпершыню. “Жывапісам я да гэтага не займаўся. А на занятках у Сталярова было вельмі цікава. Спачатку пісалі найпрасцейшыя прадметы побыту, садавіну, гародніну... Чорную акварэльную фарбу Сталяроў адразу сказаў аддаць яму і не распакоўваць, каб мы пачыналі жывапіс без гэтага колеру. Такі быў ход. (...) Я вельмі стараўся засвоіць матэрыял”.[17]

[12] Інтэрв’ю з В. Шамшурам. 2022 г.
[13] Успаміны Яўгена Панамарэнкі. Рукапіс 2022 г.
[14] Успаміны Мікалая Шышлова. Сакавік 2022 г., горад Жодзіна.
[15] З успамінаў У. Напрэенкі. Запіс – май 2023 г.
[16] З успамінаў Юрыя Чарняка – май 2023 г.
[17] Інтэрв’ю з Віктарам Данілавым. Запіс 2022 г.

Зусім іншым па тэмпераменце і падыходах да працы акварэллю быў Фелікс Фёдаравіч Гумен. “Гэты малады педагог прыйшоў да нас на другім курсе. Яшчэ нядаўна ён сам скончыў мастацка-графічны факультэт. Гумен адрозніваўся несуцішнай жыццярадаснай энергіяй. І гэта яго энергія эфектна выплёсквалася на вялікія фарматы паперы”.[18] “Гумен упершыню для многіх з нас паказаў тэхніку пісьма па вільготнай паперы”.[19] “Яго творы рабілі на нас вялікае ўражанне. Часам было незразумела, як гэта ўсё зроблена, якія тэхнічныя прыёмы выкарыстаны. Да таго ж Фелікс Фёдаравіч зачароўваў студэнтаў сваім іранічным гумарам. Некаторыя яго фразы станавіліся афарызмамі”.[20]

Студэнтаў, якія ў той час вучыліся ў Ф.Ф. Гумена, больш за ўсё захапляла вольная манера яго сакавітага акварэльнага жывапісу, эксперыменты мастака з матэрыялам. “Для нас аўтарытэт Гумена быў бясспрэчны. Ужо на першым курсе мы даведаліся аб яго ўдзеле ў Першай усесаюзнай выставе акварэлі ў Маскве (1965), трапіць куды, на наш погляд, мастаку з Віцебска было проста неверагодна”.[21] Ужо на малодшых курсах цікавасць да акварэлі сярод аднакурснікаў праявілі Уладзімір Напрэенка, які вучыўся ў Ф.Ф. Гумена, і Жэня Панамарэнка – у І.М. Сталярова.[22] “Сапраўды, Іван Міхайлавіч пакінуў асаблівы след у маім жыцці і творчасці як выдатны педагог і мастак-акварэліст, – адзначаў Я. Панамарэнка, – але ж не менш паўплываў на мяне і Гумен Фелікс Фёдаравіч, як Вялікі майстар Акварэлі, які тварыў на маіх вачах цуды”.[23]

Важную ролю ва ўсведамленні ролі мастацтва і творчасці, у вызначэнні прафесійных арыенціраў у час навучання адыгралі студэнты, якія адслужылі ў войску. Частка з хлопцаў пачала вучыцца з першага курсу, іншыя – прыйшлі давучвацца на мастацка-графічны факультэт ужо на другім курсе. Сярод іх былі: Ц. Цішуцін, В. Волкаў, У. Напрэенка, М. Глушко, В. Клюеў, А. Дасужаў, В. Васільеў, А. Ясюкайць, А. Угначоў, М. Аўсянік, В. Шамшур, С. Кічко, В. Зінекаў, А. Сафьянік, Б. Харлан. “Гэта былі людзі, якія ўжо склаліся, з пэўным жыццёвым вопытам, некаторыя былі жанаты і нават мелі дзяцей. Спачатку яны глядзелі на нас некалькі звысоку, але паступова ўсё гэта згладзілася і мы сталі сябрамі. Варта прызнаць, што яны ўмацавалі курс”.[24]

Знакавай і вельмі паважанай асобай для большасці студэнтаў быў Рыгор Піліпавіч Клікушын, які ў гэты час узначальваў кафедру малюнка і жывапісу. Р. Клікушын выкладаў “школьную дэкаратыўна-афарміцельскую справу”, а таксама графіку. “У навучальным плане графікі як навучальнай дысцыпліны тады не было, – узгадвае В. Шамшур. – У нашым распараджэнні меўся афортны станок, на якім друкаваліся лінагравюры, гравюры на кардоне і каляровыя гравюры з выкарыстаннем папяровых масак” [2].

Р. Клікушын шмат часу і ўвагі надаваў шрыфтавой графіцы. На занятках са студэнтамі вялікая роля адводзілася практыкаванням па напісанні розных шрыфтоў, увогуле, працы пяром, каліграфіі.[25] “Я любіў у яго на занятках пісаць шрыфты, – узгадваў Ю. Чарняк. – А яшчэ мне добра запомнілася, як Р. Клікушын паказваў нам малюнкі фігур і напісанне шрыфтоў гусіным пяром. Ён гэта рабіў па-майстэрску”.[26] Такім жа чынам ён пісаў аб’явы аб праглядах вучэбных работ, розных імпрэзах. “Рыгор Піліпавіч Клікушын быў незвычайным чалавекам. Апрануты заўсёды з іголачкі, ён размаўляў нягучна, але пераканаўча. Здавалася, нішто не можа яго вывесці з сябе”.[27]

Безумоўна, у памяці многіх студэнтаў захаваўся і вобраз Дз.П. Генеральніцкага. “Ён выкладаў у нас скульптуру і пластанатомію. Як выкладчык ён быў прынцыповы, як сказалі б сёння – круты. Скульптурная майстэрня Генеральніцкага, што размяшчалася ў падвале, была для выбраных. Памятаю, Мікалай Таранда быў там увесь час. Калі хацелі яго знайсці – ведалі, што ён у Генеральніцкага”.[28] Каб зразумець узровень патрабавальнасці, уласцівы Генеральніцкаму, варта прыгадаць такі факт: за выкананыя пасля вывучэння курса пластанатоміі заданні на курсе былі выстаўлены толькі дзве выдатныя адзнакі – М. Гугніну і Ю. Чарняку.

“Вялікім аўтарытэтам у студэнтаў карыстаўся і Валянцін Карлавіч Зейлерт. Педагагічны малюнак ён ператвараў у сур’ёзную дысцыпліну. Ён выклікаў нас маляваць на дошцы лісце, кветкі, грыбы, жывёл, чалавека... І гэтая была няпростая справа. Ён і сам маляваў рубам крэйды, плоскасцю”.[29]

Сярод маладых мастакоў, што ў 1960-я гады прыйшлі працаваць на кафедру малюнка і жывапісу было нямала сапраўды таленавітых, захопленых мастацтвам творцаў. Ім, як прыгадвалі выпускнікі, належала важная роля ў фарміраванні творчых прыярытэтаў у студэнтаў.

[18] Успаміны Мікалая Шышлова. Сакавік 2022 г., горад Жодзіна.
[19] З успамінаў У. Напрэенкі. Запіс – май 2023 г.
[20] Успаміны Мікалая Шышлова. Сакавік 2022 г., горад Жодзіна.
[21] Успаміны Мікалая Гугніна. 2022 г.
[22] Інтэрв’ю з Мікалаем Тарандам. Запіс 2022 г.
[23] Успаміны Яўгена Панамарэнкі. Рукапіс 2022 г.
[24] Успаміны Мікалая Шышлова. Сакавік 2022 г., горад Жодзіна.
[25] Інтэрв’ю з Мікалаем Тарандам. Запіс 2022 г.
[26] З успамінаў Юрыя Чарняка – май 2023 г.
[27] Успаміны Мікалая Шышлова. Сакавік 2022 г., горад Жодзіна.
[28] Інтэрв’ю з Віктарам Данілавым. Запіс 2022 г.
[29] Там жа.

Ва ўспамінах неаднойчы гучалі імёны Л.С. Анцімонава, В.І. Ральцэвіча, Я.К. Красоўскага, А.В. Някрасава, А.Р. Арлова, А.В. Гаўрушкі, І.П. Хіцько, П. Арцёмава.

Хочацца ўзгадаць і кафедру чарчэння. “Для некаторых студэнтаў дысцыпліны гэтай кафедры здаваліся непатрэбнымі, – кажа М. Таранда. – Але мне і тым, хто працаваў на вытворчасці ці пазней звязаў сябе з ёй, была зразумела неабходнасць ведаў у галіне чарчэння, праекцыйнай графікі і нават сапрамата. Таму з удзячнасцю ўзгадваю тых, хто выкладаў у нас гэтыя дысцыпліны: Анатоля Фёдаравіча Арэшчанку, Алену Ціханаўну Жукаву, Леаніда Міхайлавіча Цыбульскага, Яўгена Аляксандравіча Васіленку, Якава Ільіча Вендрава”.[30] “Я таксама любіў чарчэнне, – адзначае Ю. Чарняк. – Мне вельмі падабалася вырашаць графічныя галаваломкі. І канешне ж пазней чарцёжныя навыкі і веды па гэтым прадмеце мне спатрэбіліся ў маёй прафесійнай дзейнасці”.[31]

“Шмат цёплых слоў хочацца сказаць пра Алену Ціханаўну Жукаву як пра нашага куратара. Гэта выдатны педагог, добры, разумны і клапатлівы чалавек”.[32] Яна была выдатнай жанчынай, якую студэнты гэтага курса паміж сабой называлі “наша мама”. Вельмі ініцыятыўная, прыгожая, разумная. З ёй можна было пагаварыць аб усім. “Яна была крыху старэйшая за сваіх падапечных і прыкладала шмат намаганняў, каб разварушыць нашы апатычныя душы. (…) Усім памятныя арганізаваныя па яе ініцыятыве калектыўныя паходы ў кіно. Нават у так званыя класныя гадзіны, часам для нас нудныя, яна старалася ўнесці нейкую жывінку. Пасля даклада аб міжнароднай абстаноўцы, размовы аб справах у групе Алена Ціханаўна падыходзіла да кінапраектара з бабінамі і як сапраўдны кіншчык паказвала на невялікім экране якую-небудзь кароткаметражку або мультфільм”.[33] Добрым словам узгадвалі і яшчэ аднаго куратара – Дзмітрыя Фядотавіча Новікава. “Ён выкладаў у нас працоўнае навучанне і выконваў абавязкі куратара групы. Хадзіў звычайна з чорным сшыткам і яго любімым выказваннем было: «Я ўсё занатоўваю, калі будзе стыпендыяльная камісія, усё будзе ўлічвацца!» І нам было боязна. Аднойчы ён адышоў і нам удалося зазірнуць у гэты сшытак, а там НІЧОГА няма! Ён быў добрым чалавекам”.[34]

“Я стараўся вучыцца роўна па ўсіх прадметах, – узгадваў М. Гугнін. – Канешне ж жывапіс і малюнак падабаліся асабліва. Аднак, як мне здаецца, ужо з вышыні пражытага і выкладчыкі гісторыі мастацтваў Канстанцін Канстанцінавіч Прамяніцкі, Аўсянёва, Сямён Харытонавіч Далматаў адыгралі сваю ролю ў тым, каб я ва ўласным жыцці выбраў шлях мастацтвазнаўцы і выкладчыка”.[35] “Мне таксама добра запомніліся заняткі па гісторыі мастацтваў у Аўсянёвай. Яна добра і цікава распавядала матэрыял, але мы, здаецца, дрэнна яе слухалі...”[36]

На старэйшых курсах на факультэце змяніўся дэкан: замест І.Г. Карнеева, які да таго ж вёў на першым курсе ў некаторых падгрупах малюнак, стаў В.Р. Шаталаў. “Гэта быў сапраўдны гаспадар факультэта, яго рулявы і стратэг” [3]. У ім спалучаліся адміністрацыйнасць і жаданне быць добрым чалавекам. Часам ён паступаў строга, у адпаведнасці з “літарай закона”, а часам інакш. “Напэўна, у яго быў нейкі нюх. Гэта быў дасведчаны кіраўнік. Пры ўсіх яго мінусах пры Шаталаве ўсё трымалася. (...) У нас амаль усе хлопцы падпрацоўвалі. Шаталаў ішоў нам насустрач”.[37] “Пасля працы ўначы на лекцыях часам проста спалі, асабліва на гісторыі мастацтваў, калі выключалася святло і дэманстраваліся творы мастакоў”.[38]

На трэцім і чацвёртым курсах жывапіс выкладалі Вікенцій Іванавіч Ральцэвіч, Альберт Васільевіч Някрасаў, Павел Арцёмаў, Алег Рыгоравіч Арлоў, Яўген Красоўскі, Васіль Рыгоравіч Шаталаў, Аляксандр Васільевіч Гаўрушка. Прывядзём успаміны пра некаторых з іх. “У нашай падгрупе алейны жывапіс пачынаў весці П. Арцёмаў, які прыехаў у Віцебск пасля заканчэння тэатральна-мастацкага інстытута. Мне запомнілася, як ён вучыў нас пачынаць працу, рабіць на палатне падмалёвак дзвюма фарбамі – ізумруднай зялёнай і чырвоным краплакам. Гэта быў цікавы прыём. Але потым я перайшоў да Ральцэвіча, які выкладаў алейны жывапіс і малюнак”.[39] “А ў нас жывапіс вёў А. Арлоў, – успамінае М. Таранда. – Як выкладчык ён быў вельмі нешматслоўны. Але мне вельмі падабалася яго манера жывапісу. Мы з ім пасябравалі і гэта сяброўства працягнулася ўсё жыццё Алега Рыгоравіча”.[40] “На чацвёрты курс у нашу падгрупу прыйшоў выкладаць жывапіс выпускнік манументальнага аддзялення Ленінградскага вышэйшага мастацка-прамысловага вучылішча імя Мухінай А.В. Някрасаў, – адзначае М. Шышлоў. – Ён уважліва прыглядаўся

[30] Інтэрв’ю з Мікалаем Тарандам. Запіс 2022 г.
[31] З успамінаў Юрыя Чарняка – май 2023 г.
[32] Успаміны Яўгена Панамарэнкі, рукапіс 2022 г.
[33] Успаміны Мікалая Шышлова. Сакавік 2022 г., горад Жодзіна.
[34] Інтэрв’ю з Віктарам Данілавым. Запіс 2022 г.
[35] Успаміны Мікалая Гугніна.
[36] З успамінаў У. Напрэенкі. Запіс – май 2023 г
[37] Інтэрв’ю з Віктарам Данілавым. Запіс 2022 г.
[38] З успамінаў Юрыя Чарняка – май 2023 г.
[39] Інтэрв’ю з Віктарам Данілавым. Запіс 2022 г.
[40] Інтэрв’ю з Мікалаем Тарандам. Запіс 2022 г.

да кожнага з нас, ненадакучліва раіў шырэй глядзець на натуру, недзе ўзяць колер чысцей, ад чагосьці адмовіцца. На занятку па жывапісе прыносіў таўшчэзную кнігу з добрымі ілюстрацыямі і знаёміў нас з вялікімі мексіканцамі: Д. Рыверам, Х. Ароскам, Д. Сікейрасам і іх творчасцю. З часам ён стаў для мяне асабіста лепшым настаўнікам”.[41]

Было ў студэнтаў і некалькі дысцыплін, якіх сёння ўжо няма ў праграме ўстаноў вышэйшай адукацыі. Так, выкладалася пераплётная справа і нават кіраванне аўтамабіля. Пра свой вопыт здачы заліку па гэтым выключна “мастацкім” курсе і тое, як зухавата яна пракаціла маладога румянага інструктара па вузкай дарозе над абрывам у Мазурына, добра памятае Р. Шабанава.[42]

У 1965 годзе была створана кафедра працы і дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва на чале з А.Ф. Кавалёвым, выпускніком Ленінградскага вышэйшага мастацка-прамысловага вучылішча імя В.І. Мухінай. Важным момантам для вызначэння кафедрай творчых прыярытэтаў у працы стала прыняцце ў 1966–1967 гг. на кафедры праграм па мастацкай апрацоўцы драўніны, металу і па мастацкай апрацоўцы тэкстылю [3]. Пасля заканчэння мастацка-графічнага факультэта на гэтай кафедры пакінулі працаваць А.І. Сямёнава і І.П. Хіцько. Першы вёў чаканку, другі – разьбу па дрэве. “Сярод маіх аднакурснікаў, – узгадвае В. Данілаў, – былі тыя, каму гэты накірунак творчасці аказаўся вельмі блізкі. Так, Іван Бацёнга да Віцебска скончыў ва Украіне нейкую мастацкую вучэльню па разьбе па дрэве. Выдатна маляваў, умела выконваў усе віды разьбярства. Ён да трэцяга курса з намі правучыўся, зрабіў алею перадавікоў вытворчасці ў трамвайным парку. Хіцько запрашаў нас да сябе ў гурток. Студэнты рэзалі лыжкі, рабілі шкатулкі. У мяне нават музей набыў шкатулку і кружку з разьбяной ручкай у выглядзе Канька-Гарбунка”.[43]

Многія выпускнікі добра памятаюць прагляды навучальных прац, якія праходзілі на другім паверсе старога корпуса. “Малюнкі і графічныя працы звычайна выкладалі на падлозе, жывапісныя палотны ставілі ўздоўж сцяны”.[44] “Для нас гэта было выпрабаванне і свята. Да прагляду рыхтаваліся грунтоўна, з трывогай і радасцю. Але, як большасць студэнтаў, рабілі гэта ў апошнія дні. Першымі гледачамі былі мы самі, а потым збіралася камісія”.[45] Камісія ўключала педагогаў па спецпрадметах, загадчыка кафедры Клікушына і дэкана Шаталава. Крок за крокам камісія ацэньвала працы кожнага студэнта. “Час ад часу на лепшых працах з’яўляўся значок, які азначаў, што гэту работу забяруць у фонд кафедры”.[46] “Часта меркаванні педагогаў былі розныя, выкладчыкі спрачаліся. Пацешна ўспамінаць, як мы падслухоўвалі і падглядвалі за тым, як гэта адбывалася. Многія з выкладчыкаў глядзеліся вельмі каларытна: “вялізны” Генеральніцкі, шчуплы, падобны на Віцына, Гаўрушка, суровы Арлоў, гаваркі тэарэтык Далматаў, дэмакратычны на адзнакі Ральцэвіч, інтэлігентны Клікушын... Часта па жэстах і ўрыўках фраз можна было прадбачыць вынікі праглядаў. Лепшыя працы адразу забіралі ў фонд, які захоўваўся ў Ніны Станіслаўны”.[47]

Безумоўна, у канцы 1960-х разважаць пра радыкальны нонканфармізм у творчасці студэнтаў рэгіянальнай ВНУ было б няправільна. Разам з тым скіраванасць на свабоду і наватарства творчага мыслення ў гэтыя гады былі ўласцівыя студэнцтву. “Малчанаў, які славіўся мянушкай «Бацяя», стараўся вылучыцца сваімі кампазіцыямі, у якіх парушаліся прынцыпы рэалістычнай пабудовы. Пошукам сваёй мастацкай мовы вылучаліся творы Трухана, Васільева, Дасужава”.[48] “Гэта была такая артыстычная багема. (...) У Дасужава быў інтэлектуальны жывапіс, схематычны, умоўны. (...) Спрабаваў маляваць па рознаму і Трухан. (...) У яго была добрая падрыхтоўка. Увогуле, прыхільнасць да эксперыменту была ўласціва работам Васільева, Трухана, Дасужава...”.[49]

**Захапленне творчасцю.** Творчая атмасфера, якая панавала на факультэце, моцна ўплывала на студэнтаў. Абыякавых да мастацтва здавалася не існавала. “Мы вучыліся не толькі ў педагогаў, вучыліся адзін у аднаго, у старэйшых студэнтаў, хадзілі на выстаўкі, глядзелі працы віцебскіх мастакоў”.[50] Арыентацыя на творчасць, высокая ступень актыўнасці, гатоўнасць прыкласці любыя намаганні для дасягнення пастаўленай мэты былі ўласцівыя многім студэнтам гэтага курса. З вышыні сённяшняга дня зразумела, што гэта сапраўды было асаблівае пакаленне студэнтаў. Пакаленне, штуршком для якога стала “эпоха шасцідзясятых” – час, калі дух творчасці вітаў у паветры, які пранізваў сабой літаральна ўсё [3].

Сапраўднай школай для творчых эксперыментаў студэнтаў сталі творчыя гурткі па графіцы, скульптуры, акварэлі. Вялікай

[41] Успаміны Мікалая Шышлова. Сакавік 2022 г., горад Жодзіна.
[42] Успаміны Рэгіны Шабанавай. Рукапіс 2022 г.
[43] Інтэрв’ю з Віктарам Данілавым. Запіс 2022 г.
[44] Інтэрв’ю з Мікалаем Тарандам. Запіс 2022 г.
[45] Інтэрв’ю з Віктарам Данілавым. Запіс 2022 г.
[46] З успамінаў Юрыя Чарняка – май 2023 г.
[47] Інтэрв’ю з Віктарам Данілавым. Запіс 2022 г.
[48] Інтэрв’ю з В. Шамшурам. 2022 г.
[49] Інтэрв’ю з Віктарам Данілавым. Запіс 2022 г.
[50] Успаміны Мікалая Шышлова. Сакавік 2022 г., горад Жодзіна.

папулярнасцю карыстаўся гурток графікі пад кіраўніцтвам Р.П. Клікушына, дзе студэнты засвойвалі тэхнікі друкаванай графікі. “Мы выконвалі творчыя працы ў розных тыражных тэхніках: каляровыя эстампы з выкарыстаннем прамасленых масак з паперы, гравюры на кардоне, фанеры, лінолеуме. На лінолеуме рэзалі шчасліўчыкі, якія здолелі самастойна зрабіць разцы ці «дастаць» іх. Практыкаваліся справаздачныя гуртковыя выставы эстампаў з наступным іх абмеркаваннем” [2]. У эстампнай майстэрні МГФ ВДУ імя П.М. Машэрава да гэтага часу захоўваюцца чатыры альбомы, у якіх сабраны дзясяткі графічных работ, што былі выкананы студэнтамі ў 1968–1970 гг. [4].

Амаль што на працягу ўсяго перыяду навучання заняткі гуртка скульптуры наведваў Мікалай Таранда, рыхтуючыся абараняць дыпломную працу ў пластыцы. На гуртку ў Дз. Генеральніцкага “мы шмат увагі надавалі вывучэнню відаў скульптуры, анатоміі... Але што самае галоўнае, – ляпілі з «жывой мадэлі». Асабліва радавала тое, што наш педагог, Дзмітрый Паўлавіч, стаяў і працаваў разам з намі. Мы маглі назіраць за працэсам...” [5].

Дзякуючы Ф. Гумену і І. Сталярову з сярэдзіны 1960-х акварэль становіцца на мастацка-графічным адной з найбольш папулярных тэхнік. Нават тыя, хто займаўся на аўдыторных занятках у Сталярова, на гурток прыбягалі да Гумена. Фелікс Гумен не спадзяваўся на славесныя тлумачэнні, а браў у рукі пэндзаль і маляваў. Ён займаўся са студэнтамі не толькі ў інстытуцкіх аўдыторыях, але шмат працаваў на пленэры, падтрымліваў свабоду і эксперыментатарства. А яшчэ, прыцягваў да сябе ўлюблёную ў мастацтва моладзь актыўнай выставачнай дзейнасцю.

Акрамя творчасці некаторыя студэнты яшчэ займаліся і навуковай працай. Так, В. Шамшур узгадвае, як за навуковую працу, звязаную з праграмаваннем, пад кіраўніцтвам Л.М. Цыбульскага, які чытаў курс сапрамату, ён атрымаў нават грашовую прэмію.[51] Ганаровай граматай міністэрства адукацыі за сваю навукова-даследчую работу па мастацтвазнаўстве быў узнагароджаны і Ю. Чарняк.[52]

**Пленэры і мастацкія выставы.** Пленэры, творчыя вандроўкі ў час летніх канікулаў, былі арганічнай часткай жыцця студэнтаў, месцам, дзе асабліва выразна праяўлялася іх творчая апантанасць. “На занятках па дрэваапрацоўцы мы загадзя зрабілі сабе эцюднікі для пленэраў, – узгадваў В. Шамшур”.[53] Выхад на эцюды, паездка на пленэр звычайна завяршаліся выставамі. Менавіта такую персанальную выставу пасля летніх канікул, з падтрымкай І.М. Сталярова, ужо на першым годзе навучання арганізаваў Уладзімір Напрэенка.[54]

На двух першых курсах вучэбныя пленэры праходзілі ў Віцебску. Але найбольш цікавымі для студэнтаў былі творчыя вандроўкі па краіне. Адным з самых актыўных у гэтым сэнсе быў, напэўна, Віктар Данілаў. Геаграфія яго пленэрных вандровак уражвае: падарожжа па Крыме (лета 1967), Ташкент, Самарканд, Бухара, Ангрэн (лета 1968), Памір (лета 1969), Пскоў (лета 1970). З кожнай з паездак ён прывозіў эцюды алеем, акварэллю, замалёўкі. “Ужо першая вандраванне-пленэр даў не менш, чым працэс вучобы ў інстытуце. Пасля гэтага падарожжа мы з Гугніным зрабілі выставу. На гэтай выставе Ф. Гумен папрасіў падарыць эцюд, які яму спадабаўся. Для мяне гэта быў вялікі гонар!”[55]

Удзел у выставачнай дзейнасці заўсёды лічыўся сапраўдным крытэрыем творчай актыўнасці студэнтаў. “Добра памятаю нашу выставу, на першым курсе, у калідоры старога будынку мастацка-графічнага факультэта. Выставілі свае работы тры студэнты: Мікалай Гунін, Яўген Панамарэнка і Юрый Чарняк. Мы гэтым ганарыліся і ў падарунак ад кафедры жывапісу атрымалі акварэльную паперу «таршон», акварэльныя фарбы і пэндзлі”.[56] Другая выстава Ю. Чарняка адбылася ў 1967 годзе пасля яго вяртання з цаліны. “Гэта была персанальная выстава, на якой я паказаў намаляваныя мной партрэты”.[57] Пра свой удзел у выставах узгадваў і М. Таранда: “На другім курсе я прадставіў больш за 20 эцюдаў. На гэтай выставе пазнаёміўся з Леанідам Анцімонавым”.[58] Выставы адкрываюцца не толькі на тэрыторыі навучальнай установы, але і ў горадзе. Падобныя экспазіцыі з удзелам выкладчыкаў і студэнтаў мастацка-графічнага факультэта арганізоўваліся, пачынаючы з 1965 года, як узгадваў Леанід Анцімонаў.[59] Яўгену Панамарэнка памятаецца ўдзел у такой выставе студэнтаў у старой выставачнай зале па вуліцы Леніна, дзе ён экспанаваў дзве акварэлі і плоска выемкавую разьбу па дрэве.

Студэнты наведвалі і выставы, што адкрываліся ў Маскве. “Запомнілася групавая паездка на Усесаюзную выставу ў Цэнтральнай выставачнай зале СССР (Манеж, 1967), наведванне Трэццякоўскай галерэі, Музея выяўленчых

[51] Інтэрв’ю з В. Шамшурам. 2022 г.
[52] З успамінаў Юрыя Чарняка – май 2023 г.
[53] Інтэрв’ю з В. Шамшурам. 2022 г.
[54] З успамінаў У. Напрэенкі. Запіс – май 2023 г.
[55] Інтэрв’ю з Віктарам Данілавым. Запіс 2022 г.
[56] Успаміны Яўгена Панамарэнкі. Рукапіс 2022 г.
[57] З успамінаў Юрыя Чарняка – май 2023 г.
[58] Успаміны Мікалая Таранды. 2022 г.
[59] Рукапіс інтэрв’ю з Л.С. Анцімонавым, снежань 1999. Архіў М.Л. Цыбульскага.

мастацтваў імя Пушкіна.[60] "Велізарная выстава, прысвечаная стагоддзю Анры Маціса (1969), а таксама шэраг іншых выставак з наступным іх абмеркаваннем".[61]

**Часопіс "Брацкі веснік".** Адметнай з'явай гэтага выпуску стала падрыхтоўка і выданне рукапіснага часопіса пад назвай "Брацкі веснік". Часопіс лічыўся паўпадпольным, хаця пра яго ведаў Р.П. Клікушын і іншыя выкладчыкі факультэта. "Ідэя «Брацкага весніка» нарадзілася ў нашым пакоі, – узгадвае М. Шышлоў. – У пачатку семестра нам пачалі чытаць курс «Атэізм». Лекцыі часта перамяжоўваліся цытатамі са штомесячнага часопіса евангельскіх хрысціян-баптыстаў «Брацкі веснік». Здаецца, гэта Саша Дасужаў прапанаваў выдаваць (гучна сказана!) свой гумарыстычны часопіс, які б асвятляў студэнцкія справы курса, факультэта, інстытута. Першыя нумары часопіса выглядалі так: браўся звычайны школьны сшытак у клетку дванаццаці старонак за 2 капейкі і разразаўся напалову. Такімі былі першы і некалькі наступных нумароў «часопіса». У выпусках змяшчаліся шаржы (толькі сяброўскія) на аднакурснікаў і выкладчыкаў, скетчы, анекдоты, замалёўкі, смешныя выразы, жарты. Першы нумар рабілі з цяжкасцю і доўга. Не было вопыту і адпаведнага матэрыялу. Праз некалькі месяцаў, калі колькасць рэспандэнтаў значна павялічылася, памер часопіса вырас да цэлага сшытка. А апошнія нумары былі зроблены на чарцёжнай паперы і нават дзе-нідзе з фотаздымкамі".[62] У гэты час карыкатурай на курсе захапляліся многія. "З сённяшняга пункту гледжання, часопісы былі на дзіцячым узроўні, кароткія тэксты, афарызмы нашых педагогаў. Але знайшоўся нехта, хто палічыў, што гэта шкодная з'ява. З гэтай нагоды «прашарсцілі» ўсіх і папярэдзілі, каб мы ўсё гэта спынілі.[63] Відавочна, разбіральніцтва не мела працягу толькі таму, што гэта быў выпускны курс і да таго ж студэнты добра вучыліся.

Тым не менш выпуск часопіса не спыніўся. Яго значнасць і якасць з часам толькі павышалася, але немудрагелістыя малюнкі і допісы пад імі былі зразумелыя часцей за ўсё толькі студэнтам курса. Праўда і педагогі часта прасілі яго паглядзець, разумеючы, пра што ідзе размова. На працягу трох семестраў было выпушчана каля 20 нумароў "Брацкага весніку". Часта нумары сыходзілі невядома куды, таму нейкага архіва амаль не існуе. Калі назапашвалася пэўная колькасць матэрыялу, тады ў пакоі нумар 81 за вялікім круглым сталом збіраўся "клуб рэдактараў". Вядома, склад яго часам мяняўся. Але сярод асноўных рэдактараў былі А. Дасужаў, В. Васільеў, Л. Мірзаян, М. Шышлоў і В. Трухан з нязменнай гітарай.

**Мастацкая самадзейнасць і спорт.** Пры В. Шаталаве творчая актыўнасць студэнтаў у розных формах музычнага, харэаграфічнага мастацтва ўсяляк падтрымлівалася. "Паколькі наш факультэт размяшчаўся ў адным корпусе з факультэтам пачатковых класаў, многія нумары мастацкай самадзейнасці таксама ставіліся сумесна, – адзначае Ю. Чарняк. – Я танчыў з пятага класа... У інстытуце прыцягваў мяне да канцэртаў В. Алтыбаеў, які кіраваў танцавальным калектывам. Звычайна мы выконвалі народныя танцы і танцы народаў свету. У інстытуце я зацікавіў танцамі В. Данілава і В. Скобава".[64] "Сапраўды, мы пазнаёміліся на першым курсе праз танцавальны калектыў, – падкрэслівае В. Данілаў. – У дзяцінстве я з 6 да 10 год займаўся ў калектыве народнага танца. А ўжо ў час вучобы на мастацка-графічным факультэце менавіта дзякуючы танцам атрымаў сваю першую стыпендыю".[65] Даволі часта ў інстытуце праводзіліся конкурсы мастацкай самадзейнасці, у якіх студэнты гэтага выпуску прымалі самы актыўны ўдзел. Пазней, калі Алтыбаеў стаў кіраваць танцавальным калектывам у галоўным корпусе, В.Р. Шаталаў даручыў рыхтаваць праграму з танцамі Ю. Чарняку. І калі на трэцім курсе праходзіў студэнцкі фестываль, менавіта Чарняк паставіў для гэтага конкурсу некалькі танцаў. "А яшчэ зімой мы ездзілі з агітбрыгадамі выступаць у падшэфныя калгасы. Кожны выхадны недзе праходзілі такія канцэрты".[66]

Звычайна канцэрты ладзіліся на факультэце і ў галоўным корпусе, што размяшчаўся на вуліцы Замкавай. Віктар Данілаў да таго ж выступаў з вакальнымі нумарамі. Яго слухалі з задавальненнем. У Данілава былі ўлюблёныя песні – часцей за ўсё з рэпертуара Магамаева, Хіля, Абадзінскага. Яму даводзілася выступаць і на тэлебачанні, і ў кафэ "Маладзёжнае". Танцавальны і вакальны калектывы два разы ездзілі выступаць у Даўгаўпілс, а таксама на фестываль песні ў Вільню. "Там ладзілі дзень танца і дзень песні. Туды прыязджала вялікая колькасць калектываў ад рэспублік. Ад Беларусі ехалі мы і БДУ".[67]

Спортам займаліся не толькі ў вольны час, а амаль што прафесійна – удзельнічалі ў спаборніцтвах. Аляксандр Дасужаў добра гуляў у валейбол. Царык быў баскетбалістам і

[60] Успаміны Яўгена Панамарэнкі. Рукапіс 2022 г.
[61] Успаміны Мікалая Шышлова. Сакавік 2022 г., горад Жодзіна.
[62] Там жа.
[63] Інтэрв'ю з Віктарам Данілавым. Запіс 2022 г.
[64] З успамінаў Юрыя Чарняка – май 2023 г.
[65] нтэрв'ю з Віктарам Данілавым. Запіс 2022 г.
[66] З успамінаў Юрыя Чарняка – май 2023 г.
[67] Інтэрв'ю з Віктарам Данілавым. Запіс 2022 г.

ўвесь час прападаў на зборах і спаборніцтвах. Баскетболам займаўся і Я. Панамарэнка. "Наша каманда ездзіла ў Магілёў, Смаленск і Брэст на спаборніцтвы, дзе мы выступалі за наш педінстытут".[68] Па заканчэнні інстытута М. Шышлову нават прапаноўвалі застацца працаваць на кафедры фізічнага выхавання. "Я чатыры гады гуляў у футбол за інстытут, а на чацвёртым і пятым курсах змагаўся на гарадскіх, абласных, рэспубліканскіх спаборніцтвах па барацьбе. (...) Калі прапанавалі застацца на спорткафедры, то без ваганняў рашуча адмовіўся. Ужо тады я разумеў, што вялікім спартоўцам мне не быць".[69]

**"Планета Цаліна".** Студэнцкі рух называўся трэцім працоўным семестрам. У гэтым руху бралі ўдзел мільёны беларускіх студэнтаў. У 1966–1970 гг. "гэта была нейкая асаблівая актыўнасць, несуцішная энергія студэнцтва, – успамінае М. Таранда. – Худграфаўцы прымалі самы актыўны ўдзел у гэтых ударных маладзёжных будоўлях".[70]

Упершыню ўлетку 1966 года студэнты прынялі ўдзел у асваенні "віцебскай цаліны". "Наш будатрад паехаў у Чашнікі, – адзначаў В. Данілаў. – Камандзір атрада – Волкаў, брыгадзір – Таранда. У Чашніках мы будавалі – выконвалі земляныя работы, залівалі падмурак, рабілі апалубку, цагляны мур... Нас было каля 15 чалавек. Жылі ў вагончыках. З нашых былі Таранда, Волкаў, Гугнін, Чарняк, Бацёнга, Данілаў, Кавальчук, Шабанава, Мяцеліца. І будучая жонка Мікалая Таранды – Тамара Хруцкая".[71]

Але, канешне ж, самай запамінальнай была паездка ў будатрад у Казахстан. "Я двойчы ездзіў у будаўнічы атрад на цаліну, – успамінае М. Таранда. – Першы раз камандзірам атрада ездзіў Мікалай Ставер з кафедры філасофіі. Мы будавалі аўчарні – памяшканні для ўтрымання авечак, майстэрні для камбайнаў. Добра зараблялі. Перад тым як паехаць на цаліну, студэнтам трэба было здаць экзаменацыйную сесію датэрмінова, прайсці медкамісію, а потым нас чакала доўгая дарога. Мы патрапілі ў сапраўдныя цалінныя ўмовы. Прывазная вада і стэпавыя прасторы. Частыя палявыя буры..."[72] "Наш атрад называўся «Брыганціна». Мы зрабілі самі эмблему. Выразалі на лінолеуме, аддрукавалі і прышылі сабе на адзенне".[73]

На цаліну ехалі трое сутак у цягніку. З'язджалі ўвечары, канчатковая чыгуначная станцыя Аляксандраў Гай. "Там нас пасадзілі ў грузавыя машыны і мы дабіраліся да месца свайго лагера – пасёлка Казталаўка ў Фурманаўскім раёне. Размясцілі нас у будынку інтэрната. Мы пабудавалі там школу, клуб. Камандзірам атрада быў Фёдар Ціханаў з фізмата. Прымаючы ўдзел у летнім працоўным семестры, мы яшчэ знаходзілі час і на мастацкую самадзейнасць, мы выступалі... Маёй напарніцай па танцах была Ася Зіноўева, з якой мы выконвалі мексіканскі танец і беларускую польку. Я таксама танцаваў танец «Яблачка». Аднойчы нават выступалі на фестывалі, дзе сустракалася некалькі атрадаў".[74]

У 1967 годзе на будаўнічых аб'ектах Уральскай вобласці працавала некалькі атрадаў з Віцебска. Імі была пабудавана вялікая колькасць аб'ектаў. Атрадам "Брыганціна" Віцебскага педагагічнага інстытута сярод насельніцтва Фурманаўскага раёна было прачытана некалькі лекцый, дадзена 2 канцэрты мастацкай самадзейнасці. Байцы СБА прайшлі па месцах баёў легендарнай Чапаеўскай дывізіі [6]. "Сярод СБУ ва Уральскім краі наш атрад заняў першае месца. А калі камісар штаба Натан Веліковіч убачыў, што я малюю партрэты, – узгадвае Ю. Чарняк, – ён звярнуўся да мяне з прапановай пераехаць ва Уральск і працягнуць работу ў штабе. Задача ставілася не простая – выканаць партрэты лепшых цаліннікаў для Кнігі пашаны, якая стваралася ў дзвюх версіях для ЦК УЛКСМ і ЦК ЛКСМБ. Кожны дзень да мяне прывозілі па 2–3 чалавекі для таго, каб я іх маляваў. Я маляваў у дворыку і зрабіў каля 25 партрэтаў. Некаторыя з іх былі надрукаваныя ў газеце «Прыўралле»".[75] "Вярталіся ў Віцебск мы з медалямі «За асваенне цаліны»".[76]

**Дыпломныя працы.** Выкананне дыпломных работ у галіне жывапісу, графікі, скульптуры было адметнасцю мастацка-графічнага факультэта ад самага пачатку яго існавання. У выбары тэм дыпломных работ важная роля належала ідэйнай накіраванасці, прыярытэт аддаваўся творам на гісторыка-рэвалюцыйныя, ваенна-патрыятычныя і вытворчыя тэмы. Зразумела, што тэмы, як і характар, накіраванасць творчасці дыпломнікаў, адпавядалі часу, былі падкрэслена рэалістычнымі. І разам з тым сведкі тых падзей узгадваюць шырокі дыяпазон інтэрпрэтацыі сацыяльных сюжэтаў, вольную манеру жывапісу і нават у нечым эксперыментальны характар твораў маладых мастакоў [3].

Заяўкі на выкананне дыпломных работ падавалі ўсё. Іх уважліва разглядалі на кафедры.

[68] Успаміны Яўгена Панамарэнкі. Рукапіс 2022 г.
[69] Успаміны Мікалая Шышлова. Сакавік 2022 г., горад Жодзіна.
[70] Інтэрв'ю з Мікалаем Тарандам. Запіс 2022 г.
[71] Інтэрв'ю з Віктарам Данілавым. Запіс 2022 г.
[72] Інтэрв'ю з Мікалаем Тарандам. Запіс 2022 г.
[73] Інтэрв'ю з Віктарам Данілавым. Запіс 2022 г.
[74] З успамінаў Юрыя Чарняка – май 2023 г.
[75] Там жа.
[76] Інтэрв'ю з Віктарам Данілавым. Запіс 2022 г.

Некаторым студэнтам раілі змяніць тэму, тэхніку выканання ці зрабіць якую-небудзь распрацоўку па начартальнай геаметрыі, па розных пытаннях выкладання выяўленчага мастацтва ў школе. Так ці інакш, але “на апошнім курсе ўсе заняткі па спецпрадметах ужо падспудна ўспрымаліся крыху па-іншаму, праз прызму будучага дыплома”.[77] Апошнія некалькі месяцаў перад абаронай кафедра пастаянна праглядала гатоўнасць работ, выкладчыкі хадзілі па майстэрнях, дзе ў кожнай працавалі 2–3 чалавекі, калі гэта быў, напрыклад, жывапіс.[78] Перад апошняй кафедрай дыпломныя работы прыходзілі глядзець рэцэнзенты. Пісалі водгукі.[79] Адметна, што рэцэнзентамі запрашаліся вядомыя беларускія мастакі, у большасці з Мінску і Віцебску.[80] Старшынёй дзяржаўнай экзаменацыйнай камісіі па абароне дыпломных работ у 1970-м годзе быў вядомы беларускі мастак Пётр Серапіёнавіч Крахалёў.

У фондах кафедры выяўленчага мастацтва захавалася ўсяго некалькі тлумачальных запісак да дыпломных работ 1970 года, што рабіліся па кафедры малюнка і жывапісу (зараз выяўленчага мастацтва). Большасць дыпломнікаў адзначае, што кампазіцыі дыпломных работ ствараліся на падставе вялікай колькасці накідаў, замалёвак эцюдаў, эскізаў. Аналіз прадстаўленых там матэрыялаў, рэцэнзій яскрава сведчыць пра адказнасць і сур’ёзнасць падыходаў да выканання дыпломнай работы, а таксама пра высокі ўзровень жывапісных і графічных твораў. Усе ніжэй разгледжаныя дыпломныя работы па графіцы і жывапісу атрымалі выдатныя і добрыя адзнакі.

Пад кіраўніцтвам Р. Клікушына выконвалася некалькі работ па графіцы і шрыфтах. Адна з іх – дыпломная праца *В. Данілава* на тэму “Самарканд” (серыя лінагравюр). “Намінальна кіраўніком у мяне быў Шаталаў, але рэальна вёў Клікушын. Так атрымалася, што да мяне ён ужо набраў сабе дыпломнікаў, але ж паколькі я займаўся ў яго гуртку з другога курса, ён не мог мне адмовіць”.[81] Рэцэнзент Г.Ф. Шутаў адзначаў: “Дыпломная праца В. Данілава перш за ўсё цікава па сваёй задуме. Тры графічныя лісты: «Стары Самарканд», «Самарканд-горад кантрастаў» і «Новы Самарканд» раскрываюць складаную і экзатычную карціну старажытнага горада. Каб знайсці і расказаць гэтую гісторыю, аўтару трэба было пабываць у гэтым горадзе і прарабіць вельмі вялікую карпатлівую працу па пошуку і вывучэнні матэрыялаў на гэтую тэму. (...) Праца выканана на прафесійным узроўні”.[82]

Дыпломная праца *М. Гугніна* на тэму “Горад Полацк” (серыя лінагравюр) выконвалася таксама пад кіраўніцтвам Р. Клікушына. Серыя складалася з пяці гравюр, на якіх былі адлюстраваны некаторыя гістарычныя помнікі і краявіды сучаснага Полацка. Ужо вядомы нам Г.Ф. Шутаў піша ў сваёй рэцэнзіі: “Кожнаму графічнаму аркушу ўласцівы свой падыход, але ў цэлым серыя ўяўляе сабой адзінае цэлае. Асабліва цікавыя лісты, прысвечаныя архітэктурным пабудовам мінулага – саборам Полацка”.[83]

Тэхніка лінагравюры была выбрана для дыпломнай працы на тэму “Віцебск” і *В. Волкавым* (кіраўнік Р.Ф. Клікушын). Серыя ўключала пяць аркушаў, на якіх быў адлюстраваны зімовы горад. Рэцэнзент адзначаў: “Дзякуючы своеасаблівай тэхніцы выканання лінагравюр Валерый Волкаў дасягае ў сваіх працах серабрыстай гамы, якая быццам бы свеціцца. Да рашэння сваёй дыпломнай працы аўтар падышоў прафесійна, умела выкарыстоўваючы магчымасці лінагравюры”.[84]

Трыпціх “Памежнікі”, які быў выкананы *М. Клюевым* у яго дыпломнай працы (кіраўнік Р.Ф. Клікушын) вылучаўся жанравай распрацаванасцю. “Тэма трыпціха вырашаецца нарастаючым дынамізмам (...) Усё гэта дасягаецца дзякуючы ўмеламу кампазіцыйнаму рашэнню”.[85] “Мяжа з дзяцінства бударажыла маё ўяўленне, – піша аўтар работы ў тлумачальнай запісцы, – я зачытваўся кнігамі аб слаўных хлопцах у зялёных фуражках. Мне пашчасціла служыць у пагранічных войсках на суровым Далёкім Усходзе. (...) Калі я паступіў на мастацка-графічны факультэт пасля дэмабілізацыі, я ўжо ведаў, якой будзе тэма маёй дыпломнай працы. Так ці інакш, і ўсе вольныя вучэбныя кампазіцыі я звязваў са сваёй тэмай”.[86]

У фармаце кніжнай графікі была выканана дыпломная праца *С. Кічко* (кіраўнік Р.Ф. Клікушын), якая ўяўляла сабой арыгінальна афармленае аўтарскае двухтомнае выданне ў вокладцы і супервокладцы. Тэма – беларускія народныя казкі. “Кніжная графіка – гэта вельмі складаная і карпатлівая праца, – адзначаецца ў рэцэнзіі на гэту работу. – Сюды ўваходзіць і канструктыўнае рашэнне, і архітэктоніка ўсяго выдання, пошукі

[77] Успаміны Мікалая Шышлова. Сакавік 2022 г., горад Жодзіна.
[78] Інтэрв’ю з Мікалаем Тарандам. Запіс 2022 г.
[79] Там жа.
[80] Інтэрв’ю з В. Шамшурам. 2022 г.
[81] Інтэрв’ю з Віктарам Данілавым. Запіс 2022 г.
[82] З рэцэнзіі Г.Ф. Шутава на дыпломную работу В. Данілава. Архіў кафедры выяўленчага мастацтва.
[83] З рэцэнзіі Г.Ф. Шутава на дыпломную работу М. Гугніна. Архіў кафедры выяўленчага мастацтва.
[84] З рэцэнзіі Г.Ф. Шутава на дыпломную работу В. Волкава. Архіў кафедры выяўленчага мастацтва.
[85] З рэцэнзіі Г.Ф. Шутава на дыпломную работу М. Клюева. Архіў кафедры выяўленчага мастацтва.
[86] З тлумачальнай запіскі да дыпломнай работы М. Клюева. Архіў кафедры выяўленчага мастацтва.

рашэння асобных элементаў кнігі, каляровае афармленне і многія іншыя пытанні. С. Кічко імкнецца з дапамогай характэрных элементаў арнаменту шрыфту, уласцівых Беларусі, стварыць агульную гармонію выдання".[87]

Цікавыя дыпломныя работы былі створаны і ў галіне жывапісу. "Для мяне пытанне, у якім матэрыяле рабіць дыпломную работу, не стаяла, – адзначае *М. Шышлоў*. – Толькі ў жывапісе. Мне вельмі пашанцавала, што кіраўніком у мяне стаў Альберт Васільевіч Някрасаў".[88] Тэма жывапіснай кампазіцыі М. Шышлова – "Трывожныя гады" была прысвечана перыяду арганізацыі калгасаў у канцы дваццатых–пачатку трыццатых гадоў. У тлумачальнай запісцы вельмі старанна прапрацаваны сюжэт, яго гістарычны кантэкст, характар вобразаў, каларыстычнае і пластычнае рашэнне кампазіцыі. Адчуваецца вельмі глыбокі і сур'ёзны падыход да кампазіцыі і сюжэтнай арганізацыі твора. Ацэнка камісіі – выдатна!

А.В. Някрасаў быў таксама кіраўніком дыпломнай працы *У. Малчанава* на тэму "У пачатку стагоддзя. Стачка". "У сваёй карціне я жадаў паказаць, як рабочыя згуртоўваюцца на барацьбу і гатовыя выбухнуць падобна бомбе, каб разбурыць гэтую турму прыгнечаных душ".[89] У рэцэнзіі В.Е. Ціханенка адзначаў: "Праца Малчанава, на мой погляд, выгадна адрозніваецца ад іншых дыпломных работ сваёй завершанасцю і выкананнем. (...). Аўтар добра адчувае час дадзенай падзеі, і я б сказаў, у значнай ступені перадаў гэта".[90]

Выдатную адзнаку атрымала і дыпломная праца *М. Глушко* на тэму "Віцебск індустрыяльны" (кіраўнік Я.К. Красоўскі). Яна ўключала серыю пейзажаў з выявамі шэрагу прадпрыемстваў прамысловасці: "Працаваў над гэтымі краявідамі я доўга. Зрабіў шмат накідаў, асобных элементаў прадпрыемстваў, машын, змяняў кампазіцыі".[91] Рэцэнзент мастак М.Д. Міхайлаў адзначаў: "У цэлым усе пейзажы серыі добра скампанаваныя, вытрыманыя ў каларыце, жывапіс лаканічны. Творы Глушко не назавеш натурнымі эцюдамі, гэта станковыя рэчы. (...) Серыя заслугоўвае ўвагі і станоўчай адзнакі".[92] Камісія падтрымала рэцэнзента. Ацэнка за працу – выдатна.

Гісторыка-рэвалюцыйная тэма і тэма памяці выразна прагучалі ў дыпломных працах *В. Пацэнкі* "Хадзілі мы паходамі" (З часоў грамадзянскай вайны) (кіраўнік В.Р. Шаталаў), *І. Рудчыка* – "Хвіліна маўчання" (Памяці герояў Брэсцкай крэпасці) (кіраўнік Я.К. Красоўскі), *Д. Цырліна* – "Хатынь" (кіраўнік А.В. Някрасаў). "Калі былі зацверджаны эскізы, – адзначае Д. Цырлін, – мне была прапанавана творчая камандзіроўка ў Хатынь, пасля знаходжання ў якой быў створаны канчатковы варыянт кампазіцыі".[93]

Глыбінёй асэнсавання трагедыі вайны вылучалася дыпломная работа *М. Таранды* "Маці" (кіраўнік А.Р. Арлоў), які ў тлумачальнай запісцы прызнаваўся: "У нас у сям'і было 14 дзяцей, з іх сем сыноў не вярнуліся з фронту. Рэзка ўрэзаўся мне ў памяць вобраз маці, якая дрыжачымі рукамі трымала пажоўклыя ад часу лісты ад сваіх сыноў з фронту. Колькі гора і смутку было ў яе вачах... Таму я вырашыў тэмай сваёй дыпломнай работы абраць менавіта гэтую тэму".[94] Ацэньваючы работу М. Таранды, рэцэнзент адзначаў: "Адчуваецца, што аўтар неабыякавы да ўзятай тэмы, а гэта я лічу галоўным у працы і ў выбары сюжэта. Не пакідае сумневу тое, што дыпломнік прафесійна авалодаў кампазіцыяй, малюнкам і жывапісам, тымі навыкамі, якія неабходны не толькі мастаку, але і педагогу".[95]

Часам вобразы галоўных герояў сваіх карцін на гістарычную тэму маладыя мастакі пісалі з саміх сябе. Так адбылося і ў дыпломнай рабоце *А. Вішнеўскага* "Новая школа" (кіраўнік Я.К. Красоўскі), дзе вобраз цэнтральнага персанажа – камсамольца, які вярнуўся з франтоў грамадзянскай вайны і стаў настаўнікам, мастак маляваў з сябе.

Дыпломная праца *У. Напрэенкі* (кіраўнік Ф.Ф. Гумен), якая ўключала серыю акварэльных нацюрмортаў, аказалася адной з запамінальных. Рэцэнзент В.І. Ральцэвіч адзначаў: "Адметнай асаблівасцю серыі з'яўляецца бясспрэчная тэхнічнасць. Дыпломнік па-майстэрску валодае багатым арсеналам тэхнічных прыёмаў няпростай акварэльнай тэхнікі. У акварэльных аркушах няма ўласцівай студэнтам нясмеласці, усе працы зробленыя рукой майстра, што ведае, як рабіць і як дамагчыся любога танальнага і жывапіснага эфекту".[96]

Як і папярэдняя, на "выдатна" была абаронена і дыпломная работа па акварэлі *Я. Панамарэнкі* "Віцебск сёння" (кіраўнік

[87] З рэцэнзіі Г.Ф. Шутава на дыпломную работу С. Кічко. Архіў кафедры выяўленчага мастацтва.
[88] Успаміны Мікалая Шышлова. Сакавік 2022 г., горад Жодзіна.
[89] З тлумачальнай запіскі да дыпломнай работы У. Малчанава. Архіў кафедры выяўленчага мастацтва.
[90] З рэцэнзіі В.Е. Ціханенкі на дыпломную работу У. Малчанава. Архіў кафедры выяўленчага мастацтва.
[91] З тлумачальнай запіскі да дыпломнай работы М. Глушко. Архіў кафедры выяўленчага мастацтва.
[92] З рэцэнзіі М.Д. Міхайлава на дыпломную работу М. Глушко. Архіў кафедры выяўленчага мастацтва.
[93] З тлумачальнай запіскі да дыпломнай работы Д. Цырліна. Архіў кафедры выяўленчага мастацтва.
[94] З тлумачальнай запіскі да дыпломнай работы М. Таранды. Архіў кафедры выяўленчага мастацтва.
[95] З рэцэнзіі В.Е. Ціханенкі на дыпломную работу М. Таранды. Архіў кафедры выяўленчага мастацтва.
[96] З рэцэнзіі В.І. Ральцэвіча на дыпломную работу У. Напрэенкі. Архіў кафедры выяўленчага мастацтва.

Ф.Ф. Гумен). У серыі акварэляў, якая ўключала шэсць аркушаў, адлюстраваны розныя куткі горада. Дыпломная работа Я. Панамарэнкі сведчыла "аб значных здольнасцях, і аб дастатковым валоданні тэхнікай акварэльнага жывапісу. Лепшыя аркушы серыі добра арганізаваны і закампанаваны".[97]

**Траекторыі творчасці.** Сярод выпукнікоў 1970 года нямала тых, хто прысвяціў уласнае жыццё педагагічнай дзейнасці: нехта працаваў у звычайных школах, іншыя ў мастацкіх школах, вучылішчах. Пры гэтым многія з настаўнікаў і выкладчыкаў свой вольны час аддавалі ўласнай творчасці, самарэалізацыі сябе ў розных відах мастацтва – жывапісе, графіцы, дэкаратыўна-прыкладным мастацтве, і нават у паэзіі (як Р. Шабанава). Для некаторых творчасць у іх жыцці стаяла нароўні, а часам і вышэй за выкладчыцкую дзейнасць. Аналіз прафесійнага майстэрства педагогаў па мастацтве патрабуе спецыяльнага артыкула, мы ж звярнем нашу ўвагу толькі на тых выпускніках 1970-га года, якія пакінулі значны след у гісторыі мастацтва Беларусі. А паколькі ў адным даследаванні немагчыма распавесці аб усіх дасягненнях і багацці іх творчых лёсаў, таму пазначым персаналіі найбольш вядомых творцаў толькі кароткімі даведкамі.

Многія з выпускнікоў 1970-га года прынялі ўдзел у двух выставачных праектах "Настаўнік і вучні", што арганізаваў Нацыянальны мастацкі музей Рэспублікі Беларусь. Абодва праекты былі звязаны з Віцебскай школай акварэлі. Першы з іх быў прысвечаны 70-гадоваму юбілею Фелікса Гумена (2012), другі – Івану Сталярову (2015).

У акварэлі выразна заявіў аб сабе *Уладзімір Напрэенка*. Перыяд 1970–1980-х гг. – час актыўнай творчай і выставачнай дзейнасці, перыяд пошуку сваёй манеры і тэхнічных прыёмаў. У. Напрэенка шмат вандруе, працуе на пленэрах. У яго творах паўстаюць беларускія мястэчкі, прыбалтыйскія гарады, будоўля БАМа, неабсяжныя прасторы Поўначы, непаўторнасць гарадоў Цюмені і Табольска і велічны Памір. У 1990-м майстра становіцца сябрам Беларускага саюза мастакоў, звяртаецца да жанравай і тэматычнай карціны, партрэта. Творы знаходзяцца ў Нацыянальным мастацкім музеі Рэспублікі Беларусь, фондах Беларускага саюза мастакоў, Віцебскім абласным краязнаўчым музеі, Магілёўскім абласным мастацкім музеі імя П.В. Масленікава, прыватных калекцыях.

Пераважна тэхніцы акварэлі ў творчасці аддае перавагу і *Яўген Панамарэнка*. Праца ў розны час настаўнікам малявання і чарчэння ў сярэдняй школе, выкладчыкам жывапісу ў полацкай і навапалацкай дзіцячых мастацкіх школах не перашкаджала яму прымаць актыўны ўдзел у мастацкіх выставах. З 1970 года ён пастаянны ўдзельнік міжнародных, рэспубліканскіх, абласных і замежных выставак. З 1989 года сябра Саюза мастакоў СССР, з 1992 года – Беларускага саюза мастакоў. Працы яго знаходзяцца ў Нацыянальным мастацкім музеі Рэспублікі Беларусь, Віцебскім абласным краязнаўчым музеі, Полацкай карціннай галерэі, Музеі гісторыі і культуры горада Наваполацка, прыватных зборах у Беларусі і за мяжой.

У гісторыю Віцебскай акварэлі, якая сёння вядома як унікальная з'ява і самабытная школа, свае імёны назаўжды ўпісалі А. Ясюкайць і М. Гугнін.

*Мікалай Гугнін* (1946–2022) выкладаў у ВДУ імя П.М. Машэрава, кандыдат мастацтвазнаўства (1982), дацэнт, загадчык кафедры выяўленчага мастацтва (2001–2011). Вядомы як мастацтвазнаўца, педагог, графік. Даследаваў гісторыю і праблемы развіцця беларускай кніжнай графікі. Сябра Беларускага саюза мастакоў (1991). У 1970-х – пачатку 1990-х гг. аддаваў перавагу экслібрысу, тэхніцы лінагравюры. З сярэдзіны 1990-х больш актыўна працаваў у тэхніцы акварэлі і гуашы. Работы знаходзяцца ў Нацыянальным мастацкім музеі Рэспублікі Беларусь, Нацыянальным Полацкім гісторыка-культурным музеі-запаведніку, Віцебскім абласным краязнаўчым музеі, прыватных калекцыях.

*Антон Ясюкайць* (1944–2012) вядомы як мастак, пейзажыст, графік. Пераважная большасць яго твораў – пейзажы, якія напісаны з натуры ў наваколлях Бабруйска (дзе ён жыў увесь час пасля заканчэння мастацка-графічнага факультэта), роднай вёскі Навіянка Гродзенскай вобласці, на абшарах Беларусі, Расіі, Польшчы. Актыўную творчую дзейнасць ён сумяшчаў з педагагічнай у Бабруйскім дзяржаўным прафесійна-тэхнічным мастацкім каледжы (былым 15-м Бабруйскім мастацкім прафесійна-тэхнічным вучылішчы). У мастацкіх выставах прымаў удзел з 1967 года. Удзельнік міжнародных, усесаюзных і рэспубліканскіх выставак. У 1977 годзе прыняты ў Саюз мастакоў СССР. Акрамя акварэлі пісаў у алейнай тэхніцы, аддаваў перавагу пейзажу і нацюрморту. Творы мастака знаходзяцца ў Нацыянальным мастацкім музеі Рэспублікі Беларусь, Магілёўскім абласным мастацкім музеі імя П.В. Масленікава, Мастацкім музеі імя В.К. Бялыніцкага-Бірулі (г.п. Бялынічы), мастацкай галерэі горада Светлагорска,

[97] З рэцэнзіі В.І. альцэвіча на дыпломную работу Я. Панамарэнкі. Архіў кафедры выяўленчага мастацтва.

а таксама ў прыватных калекцыях у Беларусі, Расіі, Польшчы, Чэхіі, ЗША.

Як выдатны мастак і навуковец, даследчык беларускага мастацтва заявіў пра сябе *Вячаслаў Шамшур*. Ён адзін з першых беларускіх даследчыкаў творчасці Малевіча, Шагала, Лісіцкага і іншых мастакоў паслярэвалюцыйнага Віцебска. З 1970 г. В. Шамшур пачаў выкладаць у Віцебскім дзяржаўным педагагічным інстытуце (цяпер ВДУ імя П.М. Машэрава), загадваў кафедрай мастацтваў (1986–2005), сёння з'яўляецца прафесарам кафедры дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва і тэхнічнай графікі. Кандыдат мастацтвазнаўства (1980), прафесар (1993). Сябра Беларускага саюза мастакоў (1993). Свае лепшыя якасці графіка, сапраўднага майстра кампазіцыі прадэманстраваў ужо ў лінарытах, з якіх пачыналася яго творчасць. З пачатку 1990-х гадоў мастак больш увагі надае тэхніцы пастэлі, якая ў яго творчасці набыла новае гучанне, жывапісную дэкаратыўнасць і падкрэсленую дынаміку. Удзельнік мастацкіх выстаў з 1986 года, аўтар велізарнай колькасці персанальных выстаў. Творы мастака знаходзяцца ў Нацыянальным мастацкім музеі Рэспублікі Беларусь, Віцебскім абласным краязнаўчым музеі, Малапольскай карціннай галерэі, прыватных калекцыях Англіі, Галандыі, Латвіі, Польшчы і Беларусі.

*Віктар Данілаў* працаваў спачатку настаўнікам школы, а з 1978 года выкладаў выяўленчае мастацтва на факультэце пачатковай адукацыі Беларускага дзяржаўнага педагагічнага ўніверсітэта імя М. Танка на пасадах старшага выкладчыка і дацэнта кафедры эстэтычнай адукацыі. Ім створаны дзясяткі навукова-метадычных распрацовак і праграм, распрацаваны і ўкаранёны ў практыку аўтарскія курсы "Урокі творчасці" для настаўнікаў выяўленчага мастацтва. Як графік і жывапісец пачаў удзельнічаць у мастацкіх выставах з 1968 года. Член Міжнароднай гільдыі жывапісцаў з 1992 года. Вядомы як графік, акварэліст, аўтар шматлікіх жывапісных работ у алейнай тэхніцы. Працуе пераважна ў жанры пейзажа і нацюрморта. Вялікая серыя яго карцін прысвечана старажытнай архітэктуры Беларусі (Мір, Заслаўе, Нясвіж, Полацк) і Расіі (Пскоў, Ізборск, Тарапец, Ноўгарад, Вялікія Лукі, Пячоры). Творы мастака знаходзяцца ў фондах Нацыянальнага гістарычнага музея Рэспублікі Беларусь, пскоўскага музея-запаведніка, гісторыка-культурнага музея-запаведніка горада Заслаўе, у Нясвіжскім гісторыка-краязнаўчым музеі, музеі г. Самарканда, прыватных калекцыях Расіі, Англіі, Польшчы і іншых.

Яшчэ ў інстытуце *Мікалай Таранда* спрабаваў асвоіць усе віды і жанры мастацтва. Але пазней сканцэнтраваў увагу на станковым жывапісе і графіцы. Сябра Беларускага саюза мастакоў (1990). Паездкі ў Дом творчасці "Сенеж" (у 1977 і 1983 гг.) дапамаглі рэалізаваць талент графіка, асвоіць новыя тэхнікі. Мікалай Таранда – пастаянны ўдзельнік рэспубліканскіх і міжнародных пленэраў і майстар-класаў, суарганізатар міжнароднага арт-праекта "Калегіум" у Аршанскай гарадской мастацкай галерэі В.А. Грамыкі. З 2010 г. на пастаяннай аснове супрацоўнічае з творчым аб'яднаннем "Традыцыя" Беларускага саюза мастакоў. Работы мастака Мікалая Таранды знаходзяцца ў Нацыянальным мастацкім музеі Рэспублікі Беларусь, Нацыянальным цэнтры сучасных мастацтваў (Мінск), Дзяржаўным літаратурным музеі Янкі Купалы, Мастацкай галерэі Палаца мастацтваў горада Пернік (Балгарыя), Смаленскім дзяржаўным інстытуце мастацтваў (Расія), Віцебскім абласным музеі, гарадской мастацкай галерэі В.А. Грамыкі, Аршанскім музеі гісторыі і культуры горада, Мастацкай галерэі Полацка, у прыватных калекцыях Беларусі, Балгарыі, Германіі, Латвіі, Літвы, Польшчы, Расіі, ЗША.

Яркай фігурай не толькі ў мастацтве Беларусі, але і Польшчы паўстае *Станіслаў Кічко* (1943–2015). Першая яго выстава адбылася ў 1968 годзе ў Віцебску. Усё жыццё ён пражыў у Гродна. Спачатку працаваў у школе як настаўнік, потым у мастацкіх майстэрнях. Сябра Беларускага саюза мастакоў з 1987 года. Шмат гадоў з'яўляўся старшынёй таварыства польскіх мастакоў пры Саюзе палякаў у Беларусі. Творы мастака можна знайсці ў зборы дзяржаўнага музея рэлігіі ў Гродне, у прыватных калекцыях Беларусі, Польшчы, Германіі, Аўстрыі, Галандыі, Бельгіі і ЗША. Станіслаў Кічко быў аўтарам і выканаўцам канцэпцыі музеяў горада Гродна, афармляў інтэр'еры дома Адама Міцкевіча ў Навагрудку. У 2005 годзе быў адзначаны медалём Міністэрства культуры Польшчы.

*Міхаіл Глушко* (1944–1998) працаваў пераважна ў тэхніцы алейнага жывапісу, у жанры тэматычнай карціны, партрэта і пейзажа. З'яўляўся сябрам Беларускага саюза мастакоў (1975). Жыў у Віцебску. Творам уласцівы рэалістычны пачатак, старанная распрацоўка прасторы. Жывапісныя кампазіцыі мастака знаходзяцца ў Віцебскім абласным краязнаўчым музеі і прыватных калекцыях.

У станковым жывапісе, графіцы, яскрава працаваў *Аляксандр Дасужаў* (1945–2014). Да таго ж ён ствараў калажы, асамбляжы, аб'екты

і інсталяцыі. З’яўляўся сябрам Беларускага саюза мастакоў (1990) і творчага аб’яднання “Квадрат” (1987). Аўтар канцэпцыі Пліп (паверхня, лінія, пляма). Аўтар вялікай колькасці плакатаў да розных выстаў віцебскіх мастакоў. Творы мастака знаходзяцца ў фондах Віцебскага мастацкага музея, музея “Віцебскі цэнтр сучаснага мастацтва”, прыватных калекцыях многіх краін.

Адметны шлях у сваім творчым жыцці абраў *Юрый Чарняк*, што вядомы як мастак-экспазіцыянер, дызайнер. Ён працуе ў галіне мастацкага праектавання музейна-выставачных комплексаў, інтэр’ераў, стварэння выставачных экспазіцый, афармлення гарадскіх свят і фестываляў. Сябра Беларускага саюза мастакоў (1985). Распрацаваў і прыняў удзел у рэалізацыі праектаў афармлення дзясяткаў музеяў у Віцебску і Віцебскай вобласці. Найбольш вядомыя з іх – гісторыка-краязнаўчыя музеі ў г.п. Расоны і г.п. Бешанковічы, у Віцебску – гісторыі віцебскай міліцыі, Народны музей 43-й Арміі, Народны музей 39-й Арміі, музей воінаў-інтэрнацыяналістаў, Дом-музей Марка Шагала, музей гісторыі энергетыкі Віцебскай вобласці, музей Галоўнага ўпраўлення Нацыянальнага банка Рэспублікі Беларусь па Віцебскай вобласці і інш. Прымаў удзел у комплексным мастацкім афармленні велізарнай колькасці выставак (прамысловых, тэхнічнай творчасці і інш.), мерапрыемстваў культурнай і спартыўнай накіраванасці як у Беларусі, так і за яе межамі. Удзельнік усесаюзных і рэспубліканскіх выставак. Узнагароджаны залатым медалём ВДНГ (1974), медалём “За заслугі ў выяўленчым мастацтве” (2006), лаўрэат прэміі “Сузор’е муз” (1997).

Адразу пасля інстытута ўдзел у мастацкіх выставах прымае і *Леанід Хоміч-Мірзаян*. Працуе ў манументальна-дэкаратыўным мастацтве і дробнай пластыцы. У 1995 годзе ён становіцца сябрам Беларускага саюза мастакоў. Сярод найбольш вядомых яго твораў: рэльефы з металу для віцебскай фабрыкі “Знамя індустрыялізацыі” і Наваполацкай сярэдняй школы № 8, гасцініц “Віцебск”, “Аўрора” (г. Віцебск), кінатэатра “Радзіма” ў Полацку. Мастак таксама з’яўляецца аўтарам вялікай колькасці станкавых кампазіцый (“Купалінка”, “Мой горад”, “Чаканне”, “Віцебшчына” і інш.).

*Мікалай Шышлоў* пасля заканчэння мастацка-графічнага факультэта скончыў Беларускі дзяржаўны тэатральна-мастацкі інстытут (1978). Сябра Саюза мастакоў СССР і Саюза мастакоў Беларусі (1989–2014 гг.). Стварыў каля 70 эталонаў-узораў для Барысаўскага камбіната дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва, укаранёных у вытворчасць. Апублікаваў каля 400 карыкатур у розных выданнях. Прыняў удзел больш чым у 50 рэспубліканскіх і міжнародных выставах. Ён удзельнік таксама ўсесаюзных і рэспубліканскіх выставак акварэлі. Больш за дзесяць персанальных выставак (кераміка, графіка, жывапіс) правёў ён толькі ў сваім г. Жодзіна. Творы мастака знаходзяцца ў прыватных калекцыях. Для грамадскіх інтэр’ераў вырабіў дэкаратыўныя вазы, рэльефы, пано, пласты, свяцільні, паліхромныя рэльефы ў гарадах: Бабруйску, Жодзіна, Крупках, Крычаве, Мінску, Магілёве, Ніжневартаўску, Барысаве. Некаторыя працы (кераміка, графіка) набыты Міністэрствам культуры Рэспублікі Беларусь, Мастацкім фондам БССР, іншыя – у прыватных калекцыях Германіі, Галандыі, ЗША, Ізраіля, Паўднёвай Афрыкі, Францыі і іншых краін.

Вялікі ўнёсак у развіццё народнага мастацтва зрабіў *Валерый Скобаў* (1947–2021). З 1980 года ён пачаў працаваць на заводзе керамзітавага гравію, дзе арганізаваў керамічны ўчастак. Пазней стаў вядомы як майстар-ганчар. Менавіта як кераміст ён стаў сябрам клуба народных майстроў і самадзейных мастакоў Чашніцкага раёна. Прымаў удзел у шматлікіх пленэрах па кераміцы, святах ганчарнага мастацтва, неаднойчы быў лаўрэатам фестываляў, пленэраў і конкурсаў у межах “Славянскага базару”. Яго высокі прафесіяналізм адзначаны шматлікімі дыпломамі, граматамі. Адзін з твораў мастака ўзнагароджаны срэбраным медалём на ВДНГ у Маскве.

Яшчэ адной знакавай фігурай у галіне народнага мастацтва безумоўна з’яўляецца *Зінаіда Елісеева (Мяцеліца)*. Яе вельмі самабытны і адметны стыль саломапляцення, у якім прасочваецца працяг лепшых традыцый храмавага саломапляцення XVII–XIX стагоддзяў адзначаны большасцю спецыялістаў у гэтай галіне. Працуючы настаўніцай, яна спачатку занялася саломапляценнем з дзецьмі ў школе, а пазней стала сябрам Беларускага саюза майстроў народнай творчасці. Асноўны накірунак яе творчасці – абклады абразоў. Творы маюць не толькі дэкаратыўны, але і ідэйна-змястоўны характар. У 2000 годзе адбылася першая персанальная выстава майстра. Лаўрэат спецыяльнай прэміі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь у намінацыі “Народная творчасць” (2000).

Сярод вялікай колькасці мастакоў і народных майстроў, якія зрабілі вялікі ўнёсак у розныя віды выяўленчага мастацтва, асабняком стаіць таленавіты педагог *Рэгіна Шабанава*, што як творца рэалізавала сябе ў паэзіі. Ёй належаць вершы і проза, напісаныя на рускай і

беларускай мовах. Выдадзена некалькі яе паэтычных зборнікаў. Прыкметна, што любімаму выпуску МГФ 1970 года, сваім аднакурснікам, яна прысвяціла некалькі вершаў, сярод якіх "Когда мы были молодыми" (2009), "Друзьям худграфовцам" (2014) і інш.

**Заключэнне.** Выпуск 1970 года яскрава прадэманстраваў рэальны творчы патэнцыял мастацка-графічнага факультэта. Арыентаваны на падрыхтоўку настаўнікаў малявання, чарчэння і працоўнага навучання, гэты факультэт разам з тым натхняў многія пакаленні на творчую самарэалізацыю ў мастацтве. "Са мной вучыліся шмат цікавых і таленавітых аднакурснікаў, – падкрэслівае Я. Панамарэнка. – Многія дасягнулі значных вяршыняў у навуцы і творчасці. (...). У далейшым у жыцці нам спатрэбілася ўсё, чаму вучылі. І малюнак, і жывапіс, і дэкаратыўна-прыкладное мастацтва, і кампазіцыя, і школьна-афарміцельская справа".[98] Вельмі важнай, безумоўна, была сама атмасфера, што існавала на мастацка-графічным факультэце, арыентацыя на творчую самарэалізацыю.

Гэтае пакаленне не назавеш "незаўважаным" і непрызнаным. Хутчэй наадварот. І выпускнікі мастацка-графічнага 1970 года толькі пацвярджаюць той факт, што дадзенае пакаленне дасягнула поспеху, праславіла свой час. Рэпутацыя гэтага пакалення найбольш выразна праявілася ў мове ўсіх "шасцідзясятнікаў". А яго рамантычны вобраз стаў важнай часткай шматграннага творчага працэсу XX стагоддзя.

[98] Успаміны Яўгена Панамарэнкі. Рукапіс 2022 г.

### ЛІТАРАТУРА


1. Вінаградаў, В.Н. Гісторыя мастацка-графічнага факультэта Віцебскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя П.М. Машэрава на старонках друку / В.Н. Вінаградаў // Искусство и культура. – 2018. – № 2. – С. 89–94.
2. Шамшур, В.В. История худграфа. Художник и педагог Григорий Кликушин / В.В. Шамшур // Искусство и культура. – 2018. – № 1. – С. 5–8.
3. Цыбульскі, М.Л. Вектары прыярытэтаў: ад прафесіі настаўніка да архетыпа Творцы / М.Л. Цыбульскі // Искусство и культура. – 2019. – № 3. – С. 71–84.
4. Костогрыз, О.Д. Эстампная мастерская ХГФ ВГУ имени П.М. Машерова. Коллекция графики и выставочная деятельность / О.Д. Костогрыз // Искусство и культура. – 2019. – № 3. – С. 93–100.
5. Колодовский, И.И. Педагогическое и творческое наследие Д.П. Генеральницкого / И.И. Колодовский // Искусство и культура. – 2019. – № 3. – С. 39–47.
6. Первые трудовые семестры (1963–1970 гг.) // Студенческие стройотряды Беларуси: история и современность / К.И. Баландин [и др.]; под ред. К.И. Баландина. – Минск: БНТУ, 2020. – С. 8.


*Паступіў у рэдакцыю 03.05.2023*